# Партал рэйтынгавай ацэнкі

Партал рэйтынгавай ацэнкі арганізацый, якія аказваюць паслугі, якія забяспечваюць жыццядзейнасць насельніцтва, і (або) ажыццяўляюць адміністрацыйныя працэдуры (далей – партал рэйтынгавай ацэнкі), распрацаваны ў мэтах выканання абзаца другога падпункта 4.2 пункта 4 Дырэктывы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 27 снежня 2006 г. № 2 "Аб дэбюракратызацыі дзяржаўнага апарата і павышэнні якасці забеспячэння жыццядзейнасці насельніцтва" ў мэтах:

- фарміравання сістэмы рэйтынгавай ацэнкі грамадзянамі эфектыўнасці дзейнасці дзяржаўных органаў і арганізацый шляхам анкетавання, правядзення апытанняў у глабальнай камп'ютарнай сетцы Інтэрнэт і іншых мерапрыемстваў з выкарыстаннем інфармацыйных і тэлекамунікацыйных тэхналогій;
- забеспячэння належнага ўліку інфармацыі аб ацэнках грамадзян і выкарыстання яе пры ацэнцы дзейнасці адпаведных арганізацый і правядзенні ратацыі іх кіруючых кадраў;
- павышэння эфектыўнасці працы з грамадзянамі;
- забеспячэння якасці жыццядзейнасці насельніцтва, адкрытасці дзяржаўных органаў, а таксама далейшай дэбюракратызацыі дзейнасці дзяржаўных органаў і арганізацый.

З дапамогай партала рэйтынгавай ацэнкі грамадзянам прадастаўляецца магчымасць ацаніць і пракаментаваць якасць працы дзяржаўных органаў і арганізацый, якія, у сваю чаргу, валодаюць інструментам аўтаматычнага збору адзнак іх дзейнасці грамадзянамі і ўлічваюць дадзеныя ацэнкі і каментары грамадзян для павышэння якасці абслугоўвання насельніцтва.

На падставе атрыманых адзнак грамадзян на партале рэйтынгавай ацэнкі фарміруецца рэйтынг арганізацый. Бягучае значэнне рэйтынгу, яго змяненне ў часе з'яўляюцца падставай для высноў аб эфектыўнасці дзейнасці дзяржаўных органаў і арганізацый па працы з грамадзянамі.

Рэйтынг арганізацый даступны для прагляду грамадзянам без папярэдняй рэгістрацыі і аўтарызацыі на партале рэйтынгавай ацэнкі.

Магчымасць ацэнкі дзяржаўных органаў і арганізацый на партале рэйтынгавай ацэнкі становіцца даступнай грамадзянам пасля іх рэгістрацыі і аўтарызацыі на гэтым партале з дапамогай выкарыстання лагіна і пароля.

Патрэбную арганізацыю можна знайсці любым з наступных спосабаў:

- з дапамогай пошуку на сайце;
- у сферах жыццядзейнасці або ў пераліку арганізацый на галоўнай старонцы партала;
- на карце, размешчанай у раздзеле "Рэйтынг".

Для таго, каб ацаніць арганізацыю грамадзяніну неабходна запоўніць анкету, націснуўшы кнопку "Ацаніць", у профілі гэтай арганізацыі на партале рэйтынгавай ацэнкі.

Анкета ўключае наступныя базавыя крытэрыі ацэнкі:

- прастата і зразумеласць працэсу атрымання паслугі або ажыццяўлення адміністрацыйнай працэдуры;
- даступнасць інфармацыі аб парадку атрымання паслугі або ажыццяўлення адміністрацыйнай працэдуры;
- захаванне ўстаноўленага тэрміну прадастаўлення паслугі або ажыццяўлення адміністрацыйнай працэдуры;
- ветлівасць і добразычлівасць супрацоўнікаў.

Па рашэнні дзяржаўных органаў і арганізацый анкета пры неабходнасці можа быць дапоўненая іншымі крытэрамі ацэнкі.

Працэдура ацэнкі дапускае, акрамя запаўнення анкеты, указанне назвы канкрэтнай паслугі, аказанай грамадзяніну,
ці адміністрацыйнай працэдуры, ажыццёўленай па яго заяве, дату яе аказання (ажыццяўлення), а таксама размяшчэнне каментара.

У мэтах забеспячэння аб'ектыўнасці ацэнкі грамадзянамі арганізацый не дапускаецца запаўненне анкеты адной і той жа арганізацыі больш за адзін раз у суткі адным і тым жа грамадзянінам.

[Парадак выкарыстання партала рэйтынгавай ацэнкі дзяржаўнымі органамі і арганізацыямі]

[Інструкцыя па ўнясенні звестак аб арганізацыі ў яе асабістым электронным кабінеце]

[Форма лакальнага рэестра аб'ектаў ацэнкі]

[Банер партала рэйтынгавай ацэнкі]




[Дырэктыва Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 27 снежня 2006 г. № 2 «Аб дэбюракратызацыі дзяржаўнага апарата і павышэнні якасці забеспячэння жыццядзейнасці насельніцтва»]

[Пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 13 лістапада 2019 г. № 765 «Аб партале рэйтынгавай ацэнкі»]

Пастанова Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь ад 12 снежня 2019 г. № 19 «Аб зацвярджэнні Інструкцыі аб парадку функцыянавання партала рэйтынгавай ацэнкі»

---

**Source URL:** *https://mpt.gov.by/node/7185*